# АБІТУРЫЕНТ

*Дадатак да "Настаўніцкай газеты"* 18 лютага 2010 года


Рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціравання па хіміі і біялогіі: спецыялісты РІКВ аналізуюць выкананне тэстаў па гэтых прадметах у 2009 годзе. *Стар. 7—8*

"Тэст — самая магутная падказка". У граматна сфармуляваных пытаннях змяшчаецца 1/5 усяго неабходнага для адказу матэрыялу. Рэкамендацыі па падрыхтоўцы да экзаменаў. *Стар.9*

Ці трэба звужаць падрыхтоўку да трох прадметаў? Што яшчэ патрэбна, акрамя ЦТ, каб стаць паспяховым студэнтам медыцынскага ўніверсітэта? Інтэрв'ю з першым прарэктарам БДМУ прафесарам С.Д.Дзянісавым. *Стар.10*

Вы нам пісалі... Меркаванне настаўнікаў аб якасці тэстаў па беларускай мове. Тонкасці сельскага конкурсу. *Стар.11*

Вы пыталіся... Чаму на тэсты па розных прадметах адводзіцца розны час? Наколькі проста паступіць у ВНУ праз алімпіяду? *Стар.12*





# На кансультацыю да знакамітага прафесара

**У мінулую суботу на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прайшоў дзень адкрытых дзвярэй. Нягледзячы на тое, што факультэт адчыніў свае дзверы для абітурыентаў 2010 года першы раз (наступныя сустрэчы адбудуцца ў сакавіку і красавіку), ва ўніверсітэце сабраліся маладыя людзі з розных куткоў Беларусі, каб сустрэцца з выкладчыкамі — знакамітымі дзеячамі культуры і мастацтва — і даведацца, што трэба для таго, каб стаць іх вучнямі.**

Цімафей Палунін прыехаў з Гомеля. У гэтым годзе ён заканчвае Беларускае дзяржаўнае мастацкае вучылішча (былы філіял "Глебаўкі") і мае канкрэтную мэту — стаць рэстаўратарам. Гэта ўнікальны напрамак для нашай краіны, па ім рыхтуе ўніверсітэт культуры і мастацтваў (на кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў межах спецыяльнасці "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва") і акадэмія мастацтваў. Але ў гэтым годзе набору ў акадэміі няма, таму выбар у Цімафея невялікі.

— Мяне цікавіць толькі рэстаўрацыя, — расказаў малады чалавек. — Жывапісу мяне ўжо навучылі ў вучылішчы.

Цімафей прыехаў пагутарыць з выкладчыкамі аб тым, што ўяўляе сабой спецыялізацыя, прывёз свае работы па жывапісе і малюнку.

Каб атрымаць індывідуальную кансультацыю загадчыка кафедры, доктара мастацтвазнаўства, прафесара Рыгора Шауры, Цімафею прыйшлося чакаць завяршэння дня адкрытых дзвярэй, бо кафедру дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў гэты дзень наведалі каля 30 патэнцыяльных абітурыентаў. Усе, як правіла, навучэнцы спецыялізаваных студый, многія прыехалі з раённых цэнтраў. З Беразіно прыехала цэлая група са школы мастацтваў на чале з выкладчыцай. Ім былі прадэманстраваны экзаменацыйныя работы абітурыентаў мінулых гадоў, каб маладыя людзі ведалі, на якія патрабаванні арыентавацца.

Кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляецца адной з самых моцных на факультэце. Спецыфіка навучання на гэтай кафедры заключаецца ў тым, што тут прадугледжваецца значная практыка, прычым выязная. Студэнты выязджаюць на пленэры, у экспедыцыі ў розныя куткі Беларусі: на Браслаўскія азёры, у Мір, Навагрудак, Нясвіж. Многія выпускнікі — члены Саюза мастакоў Беларусі.

Галоўны патэнцыял кафедры, канечне, заключаецца ў кадрах. Тут працуе, напрыклад, прадстаўнік беларускай дынастыі мастакоў Уладзімір Масленнікаў. Дарэчы, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Рыгор Шаура з'яўляецца адзіным доктарам мастацтвазнаўства ў рэспубліцы менавіта ў гэтым напрамку. Нядаўна Рыгор Фёдаравіч атрымаў дыплом доктара з рук Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Нягледзячы на статус, вопыт і рэгаліі, загадчык з задавальненнем і шчыра стасуецца з абітурыентамі. Па яго словах, абітурыенты часта звяртаюцца на кафедру для кансультацый, і там нікому не адмаўляюць. Сустрэчы адбываюцца ў любы час па дамоўленасці.

Цімафею Палуніну з Гомеля прафесар сказаў, што той быў бы лідарам на сваім курсе, і высока ацаніў работы маладога чалавека.

Рыгор Фёдаравіч расказаў, што для падрыхтоўкі рэстаўратараў на кафедры створаны добрыя ўмовы. Працуюць дзве добра абсталяваныя майстэрні. Наладжаны сувязі з дэпартаментам рэстаўрацыі. На практыцы студэнты працуюць у Нацыянальным мастацкім музеі, музеі гісторыі і культуры, заслаўскім музеі, у музеі старажытнай беларускай культуры пры Акадэміі навук. Рэстаўратараў рыхтуюць у малой колькасці: сёння на першым курсе вучыцца ўсяго 14 чалавек, 5 з якіх — за сродкі бюджэту. Выпускнікі займаюцца рэстаўрацыяй усіх прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (тканіны, дрэва, керамікі і інш.) і нават твораў жывапісу.

Перад кансультацыямі на кафедрах на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва прайшоў агульны сход для абітурыентаў, дзе іх праінфармавалі аб парадку прыёму, уступных іспытах, азнаёмілі з дасягненнямі кафедр.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

Настаўніцкая газета
18 лютага 2010 года



# На кансультацыю да знакамітага прафесара

(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)

Першае, што звяртае на сябе ўвагу, гэта тое, што на факультэце сумяшчаюцца розныя пласты культуры і розныя эпохі — аб гэтым гаворыць сама назва. Больш за тое, яны спалучаюцца ў межах асобна ўзятых спецыяльнасцей. Скажам, спецыяльнасць "Харэаграфічнае мастацтва", а напрамкі — "Народны танец", "Бальны танец" і "Эстрадны танец". А тэатральнаму мастацтву вучаць у межах спецыяльнасці "Народная творчасць".

На факультэце 5 выпускаючых кафедр (рэжысуры абрадаў і свят; харэаграфіі; народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; тэатральнай творчасці; этналогіі і фальклору), якія ўвогуле рыхтуюць па 5 спецыяльнасцях і 8 спецыялізацыях.

На факультэце працуе шмат знакамітых дзеячаў у галіне культуры і мастацтва. Напрыклад, загадчыка кафедры рэжысуры абрадаў і свят прафесара Пятра Адамавіча Гуда (а таксама яго выпускнікоў) ведаюць усе беларускія гарады, дзе праводзяцца фестывалі, святы, конкурсы. Штогод студэнты дапамагаюць у арганізацыі кінафестывалю "Лістападзік"; усебеларускага фестывалю нацыянальных культур, што праходзіць у Гродне, фестывалю "Славянскі базар", фестывалю народнага гумару ў Аўцюках. Адметнасцю гэтай кафедры з'яўляюцца калектывы, якія пры ёй існуюць: духоўны тэатр "Анёл", тэатр беларускай народнай гульні.

Кафедра харэаграфіі рыхтуе артыстаў, балетмайстраў, выкладчыкаў, кіраўнікоў студый, трэнераў. Загадчык кафедры — знакаміты ў нашай краіне мастацтвазнаўца і харэограф прафесар Святлана Гуткоўская. Зараз яна працуе ў журы на конкурсе "Зорка ўзышла над Беларуссю". Тут працуюць, без перабольшання, лепшыя прадстаўнікі харэаграфічнага мастацтва нашай краіны: доктар мастацтвазнаўства Юлія Чурко, народны артыст Беларусі Уладзімір Іваноў. Не абыходзяцца без студэнтаў кафедры многія мерапрыемствы сталіцы: штогадовы бал выпускнікоў, навагодні бал і іншыя. І, канечне, гордасць кафедры — творчыя калектывы, якія ўвесь час на старонках прэсы дзякуючы сваім перамогам на разнастайных конкурсах. Ансамбль кафедры харэаграфіі пад кіраўніцтвам Святланы Гуткоўскай з'яўляецца лаўрэатам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Тут дзейнічае майстэрня эстраднага танца. У вядомым тэлешоу "Зорныя танцы" ўдзельнічалі чацвёра студэнтаў-"бальнікаў", а ў ліку пераможцаў аказаўся студэнт Вячаслаў Чыжык. Сярод студэнтаў і выпускнікоў кафедры чэмпіёны Беларусі і Еўропы па спартыўных, бальных танцах.

Самая маладая кафедра — кафедра этналогіі і фальклору, створаная разам з факультэтам у 2003 годзе. Тут рэалізаваны першы ў рэспубліцы вопыт па падрыхтоўцы спецыялістаў, арыентаваных на захаванне, аднаўленне і развіццё традыцый беларускага фальклору. Кафедра набірае абітурыентаў на спецыяльнасць "Народная творчасць", напрамак "Фальклор (этнафоназнаўства)". Тут дзейнічаюць унікальныя фальклорныя калектывы, якія складаюцца са студэнтаў і выкладчыкаў. Студэнты-этнафоназнаўцы шмат часу праводзяць у экспедыцыях і збіраюць рэгіянальны фальклор.

Кафедра тэатральнай творчасці — адна з самых прывабных на факультэце, ва ўсякім разе аб гэтым сведчыць конкурс сярод абітурыентаў. У мінулым годзе ён склаў больш як пяць чалавек на месца. Сярод выпускнікоў кафедры шмат вядомых тэатральных рэжысёраў, кінарэжысёраў, акцёраў і нават телевядучых. Тут дзейнічае тэатр-студыя "Сёмы паверх" — удзельнік рэспубліканскіх і міжнародных тэатральных фестываляў. Выпускнікі кафедры працуюць у тэатры беларускай драматургіі, маладзёжным тэатры, тэатры юнага гледача і многіх іншых.

"2010 год — юбілейны для ўніверсітэта, і калі мы згадвалі імёны нашых выпускнікоў, якіх мы хацелі б бачыць у якасці гасцей на юбілейных святах, то атрымаліся вялізныя спісы ад кожнай кафедры", — зазначыла на сходзе дэкан факультэта, кандыдат культуралогіі, дацэнт Наталля Шалупенка.

На ўсе спецыяльнасці факультэта трэба здаваць, акрамя двух тэстаў, творчы экзамен. Ён і да гэтага быў комплексным, але абітурыентаў 2010 года чакае новаўвядзенне: сёлета творчы іспыт будзе складацца з трох, а не дзвюх частак. Падрыхтавацца да творчых экзаменаў можна на падрыхтоўчых курсах універсітэта, бо яны вельмі спецыфічныя. Напрыклад, на кафедры рэжысуры абрадаў і свят экзамен складаецца з акцёрскага майстэрства, рэжысуры, калёквіму. На кафедры этналогіі і фальклору — з тэорыі музычнага фальклору, беларускага музычнага фальклору і этнафанічнага аналізу. На спецыяльнасці харэаграфіі творчыя экзамены розныя для кожнага напрамку. Напрыклад, на "Бальны танец" трэба здаваць еўрапейскую праграму, лацінаамерыканскую праграму, кампазіцыю і пастаноўку танца.

Структура творчага іспыту зменена для таго, каб павысіць яго "вагу" ў параўнанні з адзнакамі за тэсты і сярэднім балам атэстата. За тры этапы творчага выпрабавання абітурыент зарабляе тры адзнакі. Такім чынам, больш шанцаў паступіць атрымліваюць менавіта творча адораныя людзі, а ў факультэта ў сваю чаргу больш магчымасцей адабраць "сваіх" абітурыентаў.

"Трэба вельмі шмат працаваць, каб дасягнуць такіх вынікаў, якія ёсць у нашых выпускнікоў і выкладчыкаў. Нашы студэнты гэта разумеюць, — зазначыла Наталля Шалупенка. — Адзін студэнт-харэограф сказаў мне мудрую рэч. Я спыталася, што ён робіць ва ўніверсітэце на канікулах? А ён адказаў, што харэаграфія — гэта штодзённая праца, кожны дзень — каменьчык, і калі ён сёння не прыйдзе і не прынясе гэты каменьчык, то заўтра яму давядзецца несці два... Хацелася б, каб гэта разумелі і абітурыенты".

**Іна НІКІЦЕНКА.**

НА ЗДЫМКАХ: Рыгор Шаура каментуе работу абітурыента Цімафея Палуніна; Дзіяна Кажарновіч займаецца ў мастацкай студыі ў Барысаве.

**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**



РЕПОЗИТОРИЙ